УДК 338(476)(091):94(476)»18/19»

# ШПАЛЕРНАЯ ВЫТВОРЧАСЦЬ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

***А. В. Бурачонак***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, burachonak@bsu. by*

У артыкуле разглядаюцца асноўныя аспекты развіцця шпалернай вытворчасці на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. Прыведзены звесткі па гісторыі вырабу шпалераў у XVIII – першай палове XIX ст. у Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі. Выяўлены асноўныя характарыстыкі дзейнасці мінскіх шпалерных фабрык І. Ф. Шыфмановіча, К. М. Кантаровіча, А. С. Г. Эпштэйна, віцебскай фабрыкі Б. Я. Мееровіча ў канцы XIX – пачатку XX ст. Вызначана месца названых прадпрыемстваў у агульнай структуры шпалернай вытворчасці Расійскай імперыі.

***Ключавыя словы:*** прадпрымальніцтва; Беларусь; прамысловасць; шпалеры; вытворчасць; Расійская імперыя.

# ПРОИЗВОДСТВО ОБОЕВ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ В КОНЦЕ XIX – НАЧАЛЕ XX В.

***А. В. Бурачонок***

*Белорусский государственный университет,*
*пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, burachonak@bsu. by*

В статье рассмотрены основные аспекты развития производства обоев на территории Беларуси в конце XIX – начале XX в. Приведены сведения об истории производства обоев в XVIII – первой половине XIX в. в Речи Посполитой и Российской империи. Выявлены основные характеристики деятельности минских обойных фабрик И. Ф. Шифмановича, К. М. Кантаровича, А. С. Эпштейна, витебской фабрики Б. Я. Мееровича в конце XIX – начале XX в. Определено место указанных предприятий в общей структуре обойного производства Российской империи.

***Ключевые слова:*** предпринимательство; Беларусь; промышленность; обои; производство; Российская империя.

# WALLPAPER PRODUCTION ON THE TERRITORY OF BELARUS IN THE END OF XIX – THE BEGINNING OF XX CENT

***A. V. Burachonak***

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus, burachonak@bsu. by*

The article examines the main aspects of the development of wallpaper production in Belarus in the late 19th – early 20th centuries. Information about the history of wallpaper production in the 18th – first half of the 19th centuries is given in the Polish-Lithuanian Commonwealth and Russian Empire. The main characteristics of the activity of the Minsk wallpaper factories of I. F. Shifmanovich, K. M. Kantarovich, A. S. Epstein, the Vitebsk factory of B. Y. Meerovich at the end of the XIX – beginning of the XX centuries are

revealed. The place of these enterprises in the general structure of wallpaper production in the Russian Empire is determined in the article.

***Key words:*** entrepreneurship; Belarus; industry; wallpaper; production; Russian Empire.

Развіццё прамысловага прадпрымальніцтва на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. адбывалася пад уплывам тэндэнцый ўключэння мясцовай гаспадаркі ў сістэму агульнарасійскага рынку. Дадзены працэс суправаджаўся шэрагам змен у галіне прамысловасці, адной з якіх стала больш глыбокая спецыялізацыя вытворчасці. Прадстаўнікі дзелавога асяроддзя беларускіх губерняў імкнуліся выйсці на расійскі рынак з прадукцыяй, на якую існаваў попыт з боку жыхароў розных рэгіёнаў Расійскай імперыі. Адначасова з гэтым адбываўся пошук той нішы, якая яшчэ не была перанасычана канкурэнтамі. Адной з такіх ніш для прадпрымальнікаў Беларусі стала вытворчасць шпалераў.

Шпалеры на тэрыторыі Беларусі выраблялiся яшчэ з часоў знаходжання яе ў складзе Рэчы Паспалітай. Вытворчасць такой прадукцыі была непасрэдна звязана з родам Радзівілаў, якія былі сапраўднымі прыхільнікамі шпалернага мастацтва і для аздаблення сцен сваіх замкаў і маёнткаў замаўлялі шпалеры ў майстроў з краін Заходняй Еўропы. Але выдаткі на стварэнне ўтульнай атмасферы ў княжацкіх валоданнях былі немалымі, таму ўжо ў першай палове XVIII ст. уласныя шпалерныя майстэрні з’явіліся ў Альбе каля Нясвіжа і ў Міры. Гэта былі прадпрыемствы невялікага памеру, якія ажыццяўлялі выраб прадукцыі не на рынак, а для задавальнення патрэб прадстаўнікоў княжацкага роду. У 1752 г. Міхал Казімір «Рыбанька» засяродзіў усю вытворчасць такой прадукцыі у Карэлічах. Варта адзначыць, што тагачасныя шпалеры былі хутчэй падобны на габелены ці бязворсавыя дываны, на якіх былі вытканы сюжэты з гісторыі роду Радзівілаў – прысяга на вернасць каралю Жыгімонту Аўгусту і яго шлюб з Барбарай Радзівіл, наданне тытула князя Свяшчэннай Рымскай імперыі Мікалаю Радзівілу Чорнаму імператарам Карлам V, бітва з Турцыяй пад Хоцімам Міхаіла Казіміра [1, с. 58–59] і г. д.

У другой палове XVIII ст. пачалося заснаванне мануфактур, якія спецыялізаваліся на вытворчасці папяровых шпалер. Праўда, узнікалі яны не на тэрыторыі Рэчы Паспалітай, а ў Расійскай імперыі. Паводле тагачасных тэхналогій шпалеры склейвалі з асобных аркушаў паперы, на якія потым уручную наносілася фарба. У прамысловых маштабах упершыню выраб такой прадукцыі пачаўся ў 1817 г. на Імператарскай

шпалернай фабрыцы, якая праіснавала да 1869 г. Разам з дзяржаўным прадпрыемствам у 1820-я гг. працавалі і прыватныя мануфактуры, але маштабы іх вытворчасці былі нязначнымі [2, с. 252–253]. І толькі, дзякуючы з'яўленню ў Расійскай імперыі ў сярэдзіне XIX ст. машыны для друкавання шпалераў, якая была запатэнтавана яшчэ ў 1823 г. лонданскім прамыслоўцам Уільямам Палмерам [3, s. 266], вытворчасць дадзенай прадукцыі набывала больш шырокія маштабы. У хуткім часе папяровыя шпалеры сталі новым трэндам у дызайне інтэр'ераў жылых памяшканняў, што падштурхоўвала прамыслоўцаў актыўна асвойваць гэтую галіну вытворчасці. З кожным годам на тэрыторыі Расійскай імперыі засноўваліся новыя прадпрыемствы, якія спецыялізаваліся на вырабе папяровых шпалераў.

Напрыканцы XIX ст., у сувязі з павышэннем па ініцыятыве фінскіх прамыслоўцаў коштаў на шпалеры, адпаведныя фабрыкі пачалі з'яўляцца і на тэрыторыі Беларусі. Большасць з іх была заснавана ў Мінску. Губернскі цэнтр нездарма стаў месцам канцэнтрацыі дадзенай вытворчасці. Варта адзначыць, што ўжо з сярэдзіны XIX ст. Мінск стаў пераўтварацца ў буйны гандлёвы, прамысловы і крэдытна-банкаўскі цэнтр. Перакрыжаванне Лібава-Роменскай і Маскоўска-Брэсцкай чыгуначных магістралей дазволіла губернскаму гораду ўзняцца на якасна новы ўзровень развіцця. Наяўнасць зручнага чыгуначнага транспарту дазваляла не толькі збываць вырабленую прадукцыю ў розных напрамках, але і засноўваць прадпрыемствы ў аддаленасці ад сыравінных крыніц. У дадатак да гэтага, на прамысловую сферу Мінска, як і ў цэлым на ўсю тэрыторыю Беларусі, распаўсюджвалася тэндэнцыя па паглыбленні спецыялізацыі вытворчасці. Калі ў пачатку 1880-х гг. мінскія прадпрыемствы па вырабе фабрычнай і заводскай прадукцыі спецыялізаваліся ў 10 сферах вытворчасці, то напярэдадні Першай сусветнай вайны праца ажыццяўлялася ў 32 напрамках прамысловай дзейнасці. Безумоўна, для вырабу папяровых шпалер вельмі важным фактарам з'яўлялася наяўнасць сыравінных крыніц. У гэтых адносінах у Мінскай губерні ўсё было добра, паколькі па паказчыку насычанасці тэрыторыі ляснымі масівамі (амаль 40 %) яна займала адну з верхніх пазіцый у Расійскай імперыі, набліжаючыся да Архангельскай і Кастрамской губерняў, дзе лясамі было занята 58,5 % і 56 % усёй тэрыторыі адпаведна [4, с. 28, 29, 32].

Першая з мінскіх шпалерных фабрык была заснавана ў 1892 г. мешчанінам І. Л. Шыфмановічам. На 1900 г. на прадпрыемстве

налічвалася 24 працоўных, аб’ём вытворчасці дасягаў 33800 руб. [5, с. 149]. За гады перадваеннага ўздыму вытворчы патэнцыял шпалернай фабрыкі асабліва не змяніўся. Прадпрыемства было абсталявана паравым рухавіком, аднак у 1913 г. аб’ём вытворчасці не перавышаў 50000 руб. [6, № 3 486]. Прыкладна ў адзін час з І. Ф. Шыфмановічам фабрыку па вытворчасці шпалераў заснаваў яшчэ адзін мінскі мешчанін Е. В. Хаюцін. Яна ўяўляла сабой таксама невялікае прадпрыемства з нязначнай колькасцю працоўных, якая па шэрагу прычын, звязаных перш за ўсё з асабістымі якасцямі яе ўладальніка, не адчула на сабе подыху індустрыялізацыі і мадэрнізацыі. У 1900 г. прадпрыемства змяніла свайго ўладальніка – ім стаў мінскі купец першай гільдыі К. М. Кантаровіч [7, арк. 8]. За наступныя пяць гадоў новы гаспадар перабудаваў фабрыку, а таксама ўсталяваў на ёй паравы кацёл [8, арк. 22; 9, арк. 5]. На фабрыцы К. М. Кантаровіча выраблялiся не толькі шпалеры, але розныя віды паперы – абгортачная, афішная, альбомная, папяросная, рознакаляровая і інш. Прадукцыя гэтага прадпрыемства пастаўлялася як у гарады беларускіх губерняў (Брэст-Літоўск, Вільня, Віцебск, Гродна, Дзвінск, Магілёў, Пінск, Полацк), так і па ўсёй астатняй тэрыторыі Расійскай імперыі (Адэса, Баку, Рыга, Варшава, Кіеў, Коўна, Чарнігаў, Батумі, Грозны, Лібава, Армавір, Стаўрапаль, Растоў на Доне, Бендэра, Бердзічаў) [10]. Дзякуючы захадам па паляпшэнні прадпрыемства і наладжванні шырокай сеткі збыту аб’ём вытворчасці на шпалернай фабрыцы К. М. Кантаровіча павялічыўся з 45000 руб. у 1900 г. да 75000 руб. у 1913 г. [5, с. 149; 6, № 3 484].

Найбуйнейшым з трох мінскіх фабрык па вытворчасці шпалер было прадпрыемства, якое заснаваў у 1898 г. А. С. Г. Эпштэйн. У 1900 г. на ім працавалі 16 чалавек, а аб’ём вытворчасці ў грашовым выражэнні складаў 36000 руб. [5, с. 149]. У снежні 1908 г. з мэтай асацыіравання капіталу для далейшага ўдасканалення вытворчай дзейнасці было створана поўнае таварыства пад назвай «Паравая шпалерная фабрыка ў г. Мінску А. С. Г. Эпштэйн і сын» [11, с. 129]. Кампаньёнам А. С. Г. Эпштэйна стаў адзін з яго нашчадкаў. Далучэнне капіталу сына да бацькавай справы дала станоўчыя вынікі. Ужо ў 1910 г. на прадпрыемстве было выраблена прадукцыі на суму 60000 руб. [12, с. 114]. Павелічэнне аб’ему вытворчасці адбылося ў выніку выхаду на рынак паўднёвых губерняў Расійскай імперыі і Каўказа, а таксама за кошт адкрыцця ў 1909 г. другога вытворчага корпуса. Апошні, праўда, праіснаваў нядоўга – у 1911 г. ён быў знішчаны ў выніку пажару. Аднак гэтая абставіна не спыніла

Эпштэйнаў на іх шляху да атрымання сталага прыбытку са свайго прадпрыемства. У 1912 г. у старым будынку быў надбудаваны яшчэ адзін паверх, куды была ўсталявана частка ацалелага падчас пажару абсталявання [13, с. 219]. Пачалася энергічная праца па аднаўленні і нарошчванні аб'ёмаў вытворчасці. У 1912 г. прадукцыя «Паравой шпалернай фабрыкі ў г. Мінску А. С. Г. Эпштэйн і сын» была адзначана залатым медалём на Ніжагародскім кірмашы. Усё гэта дазволіла выйсці прадпрымальнікам у лідары сярод усіх уладальнікаў шпалерных фабрык Беларусі па паказчыку аб'ёму вытворчасці, дасягнуўшы мяжы ў 300000 руб. [6, № 3 487].

У той час, як гаспадары мінскіх шпалерных фабрык актыўна выходзілі са сваёй прадукцыяй на агульнарасійскі рынак, у гэтай галіне віцебскім прадпрымальнікам Б. Я. Меровічам было заснавана прадпрыемства, аб'ём вытворчасці якога на 1913 г. складаў 130000 руб. [6, № 3 435].

Такім чынам, развіццё шпалернай вытворчасці на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. адбывалася ў межах тэндэнцый, якія былі характэрны для прамысловага прадпрымальніцтва беларускіх губерняў – арыентацыя на агульнарасійскі рынак [14, с. 60]. Гэта суправаджалася ростам колькасці прадпрыемстваў, паглыбленнем спецыялізацыі ў прамысловай сферы, тэхнічным ўдасканаленнем вытворчага працэсу, нарошчваннем аб'ёмаў вырабляемай прадукцыі. І гэта прыносіла свае вынікі. Так, у разглядаемай галіне вытворчасці напярэдадні Першай сусветнай вайны 4 з 23 шпалерных фабрык [6, № 3 167, 3 411, 3 435, 3 477, 3 484, 3 486, 3 487, 3 489, 3 501, 3 502, 3 505, 3 514, 3 526, 3 528, 3 529, 3 543, 3 579, 3 586, 3 590, 3 593, 3 597, 3 619, 3 621], або 17 % ад агульнай колькасці, знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі. Такім чынам, дзякуючы сваім намаганням прадпрымальнікі Беларусі станавіліся паўнавартаснымі ўдзельнікамі рыначных адносін у агульнарасійскіх маштабах, ствараючы канкурэнцыю для сваіх калег з іншых губерняў Расійскай імперыі.

**Бібліяграфічны спіс**


1. Галоўка С. Ніці страчанага хараства // Белар. думка. 2017. № 12. С. 58–65.
2. Юхнёва Е. Петербургские доходные дома. Очерки из истории быта. М.: Центрполиграф, 2019.
3. Exner W. F. Die Tapeten-und Buntpapier-Industrie für Fabrikanten und Gewerbtreibende, sowie für technische Institute. Weimar: Bernard Friedrich Voigt, 1869.
4. Бурачонак А. В. Асноўныя тэндэнцыі развіцця дзелавой актыўнасці на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. (на прыкладзе г. Мінска) // Часоп. Беларус. дзярж. ун-та. Гісторыя. 2021. № 1. С. 26–35.

5. Список фабрик и заводов Европейской России / под ред. В. Е. Варзара. СПб., 1903.
6. Фабрично-заводские предприятия Российской імперии (исключая Финляндию) / ред. Ф. А. Шобер. Пг., 1914.
7. Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 311. Воп. 1. Спр. 119.
8. Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 299. Воп. 5. Спр. 1515.
9. Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 311. Воп. 1. Спр. 280.
10. Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 455. Воп. 1. Спр. 8.
11. Сборник сведений о действующих в России торговых домах (товариществах полных и на вере). Пг., 1915.
12. Список фабрик и заводов Российской Империи / под ред. В. Е. Варзара. СПб., 1912.
13. Шыбека З. В. Минскъ сто гадоў таму. Мінск: Беларусь, 2007.
14. Каханоўскі А. Г. Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.). Мінск, 2013.